
№ 48

05/727. 1-УНКГ 26


Маланка 1926

Паасобныя №№

ГОД ВЫДАНЬНЯ ПЕРШЫ АСОБНЫ НУМАР 40 ГРОШ.



Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Завальная вуліца, № 7 Беларуская Кнігарня. «МАЛАНКА»	№ 4 22 ЛЮТАГА 1926 г.	ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на 1 год 8 злот. „ паўгоду 4 „ „ тры мес. 2 „ „ адзін м. 1 „	За граніцу: на год—тры даляры, на паўгоду—1 д. і 50 цэнт.



ЭНДЭК: — Хамы, а ня людзі гэтыя «białorusini», чаго яны скардяцца, чаго ім усё мала? Вось як мы дбаем аб падняцьце іхняй культуры, што адна з іх вёсак выглядае, як вуліца ў Парыжы. Зусім заходняя культура.

Загадам Камісара Ўраду на м. Вільню № 3 «МАЛАНКІ» быў конфіскованы за верш «Заходняя Культура» і жарт пад рысункам Ю. Монвіда «Папелец».

„МАЛАНКА".

Добры дзень табе, мой браце!
Беларусе, родны мой,
Зноў „Маланка" ў Вашай хаце
Хоча гутарыць з табой.

Слухай, братка, сядзь за столам,
Побач сядзець хай сусед:
Рэшта вёскі станьце колам
Пры стале вось тут, як сьлед.

Хто з Вас, брацьця, Вільню знаець,
Мо', калі там з Вас хто быў,
Мо', аб Вільні дзед Вам баець,
Мо', з Вас нехта Вільню сьніў?..

Пекны горад Вільня наша:
Беларусі гордасьць тут,
З Вільні ёсьць „Маланка" Ваша,
З Вільні прэць яна ў Ваш кут.

Ёсьць у Вільні подла „Рада
Тымчасова" яе зваць:
Гэтага, браточкі, гада
Вы павінны зваяваць.

Гэты гад сваю газэту
Шлець дарма на вёску Вам:
Вон ганіць! — атруту гэту,
Бо яна нясе сьмерць нам.

Грошы ёй дае Варшава,
Гэтым хоча нас труціць:
І стараецца тут жвава —
Вас палякамі зрабіць.

Павлюкевіч там кіруе,
Ён Вам кажа, што ён свой:
Братка мой, Цябе ён труе..
Плюнь яму Ты, родны мой!

Ён за польскія дукаты,
Хоча ім прадаць наш край:
Й шлець атруту ў Вашы хаты —
Знай аб гэтым, братка знай!

Беларусам ён назваўся,
Каб Табе атруты даць:
Знай, браток, што ён прадаўся,
І... ня дай цябе прадаць.

Будь здароў, браток мой родны!
Хай шчасьлівіць Табе час:
Больш скажу у час свабодны,
Як прыйду чацьвёрты раз.

Пярун.

Пакараў.

Дзямянку, чуў ці не,
Якую прыкрасьць мне
Прышлося працярпець?
— То трэба-ж сэрцы мець
Адважыцца на гэта!..

— А што? — Ды вось мая кабета:
Даўно ўжо прымячаў
Што чымсі шчокі мажа
Я ўзяў ды накрычаў...

— Ах, ты нялюдзкі, кажа:
Ня бачыш, што я хвора?
То-ж доктар мне учора
Казаў, каб так рабіла,
Ці-ж я табе ня міла?!

І я, братко, паверыў —
Характар такі маю.
Адноўчы адчыняю
Сабе паціху дзьверы
І што-ж — дасі ты веры!
Ну, ці-ж ня шэльма гэта?
Сядзіць мая Магрэта
На ложку з кумам во як —
Цалуюцца абое!

Ого! — паскудна справа...
Куды! Як станеш думаць
Ня лезе ў горла страва

Але-ж зрабіў я ім,
Каханенькім сваім...
Хай ведае кумок,
Што мне ня пяты рок;
Ня блазен я, здаецца,
Што ён з мяне сьмяецца.

Парадзь ты, братка, сам
Напрыклад. мной каб быў...
— Дык што-ж ты ім зрабіў
Цікава — як-жа там?

— А я, Дзямянку, ўзяў,
Дазваньня парубаў
На дровы ложку тую!
Цяпер трохі сумую —
Чаму быў не прадаў?...

Міхась Васілёк.

ЖАРТЫ.

Міністар Рачкевіч і „доктар“ Павлюкевіч.

Рачкевіч:

Ах, шацунак, мой „doktorze“!
Што-ж там нова? Як работа?
Як хвароба? Ці паможа?..
Можа трэба болей злота?

Павлюкевіч:

Цяжка... гадка... трудна жыці:
Трэба кожнага купіці,
Трэба кожнаму плаціці...
Радзь, мой пане!.. Што рабіці?..

Без сяброў я маю «Раду“,
На паперы ёсьць „Прасьвета“,
Й дэфэнзыва ходзіць з заду,—
Але... дзе-ж ёсьць наша мэта?..

Я-ж табе даў слова, пане!
Што згублю усіх — дачыста,
І ў мяне вось край так т а н ё,
Ты купіў за тысяч трыста.

Вось-жа я за гэты грошы,
Аднаго купіць ледзь здолеў...
Драматург з яго харошы
І паклоньнік алькаголю.

Больш купіць не абяцую,
Ну... авансік не зашкодзіць...
Бач, панок, я ўсьцяж працую,
Бо час выбараў надходзіць...

Дайце мне мандат пасольскі,
Дайце сойму мне трыбуну;
Вось тагды я „по геройски“,
Беларусі ў вочы плюну...

Я скажу для заграніцы,
Цэлы сьвет мяне пачуе —
Тут, дзе Польшчы ёсьць граніцы,
Беларусь там ня істнуе —

Рачкевіч:

Вам, я ўдзячны, мой паночку,
Праца Ваша дужа жмудна:
Ах!.. купляць паадзіночку —
Гэта-ж так страшэнна трудна.

Вам даю я паўмілёну;
Хай дужэець ваша праца...
Згодна польскаму закону:
„Podła praca — hojna płaca!“

Пярун.

ЧАТЫРЫ КАНДЫДАТЫ.

Пан Язэп Пілсудскі аканчальна разгневаўся на Польшчу... — Ён заявіў, што ня стане яе ратаваць на'т тады, калі на яе нападуць бальшавікі ці немцы... Бо гэтакую Польшчу, як ёсьць, і ня варта...

„Хай Польшча шукае сабе тады на становішча Вярхоўнага Камандзера арміі, — Ідыёта, асла, ці шую, прыязна параіў п. Пілсудскі, зьняўшы сваю кандыдатуру...

Ці-ж сапраўды на гэтае становішча ў Польшчы няма іншых кандыдатаў, апрача гэтых чатырох?

У кожным разе запрашаем п. Пілсудскага за ягоны „маланкавы“ стыль — у сталыя супрацоўнікі „Маланкі“.

У МЕНСКУ.

— Скажэце, калі ласка, што гэта значыць Г. П. У.?
— Глувны Польскі Ужонд.
— Вось яно што! Я бо гляджу, што там выключна папольску гавораць.

НА ПАЎСТАНКУ ТРАМВАЯЎ у МАСКВЕ.

— Здравствуйте, товарищ, что Вы здесь делаете?
— Трамвай под‘евреиваю.
— Что?
— Трамвай под‘евреиваю, у нас ведь теперь нельзя сказаць „под‘жидаю“, а то в Г. П. У. попадеш.

НА ПАЎСТАНКУ АЎТОБУСАЎ у ВІЛЬНІ.

Адзін з супрацоўнікаў Паўлюкевіча, заўважыўшы свайго шэфа, пытае: Добры дзень, п. Доктар, што Вы, тут робіце?

Паўлюкевіч: — Дэфэнзыўвую— панімаеце — на автобус.

Знаёмы: — Што Вы кажаце?

Паўл.: — Кажу-ж Вам, што дэфэнзыўвую..., бо ці-ж можна сказаць „Чакаю“? Могуць падумаць, што ў „Чэка“ працуеш — панімаеце...

У ДЭФЭНЗЫВЕ.

Конфідэнт: — Ты беларус?
Арыштованы: — Але.
Конфідэнт: — Камуніст?
Арыштованы: — Не!
Конфідэнт: — Што ты лжэш, сабака, гэта ж сынонімы!

Блазан.

З прычыны прыезду украінскіх здраднікаў у Вільню.

Вітаю Вас, стэповы юды!
Я, Беларус, вітаю вас;
Здаецца тут... да подлай буды,
Прыйшлі вы гэта першы раз.

А... хто-ж вас прыйме, ягамосьці,
Ах, здрайцы украінскіх мас
Вы подлы й подлых сяньня госьці:
Які Вас чорт прыгнаў да нас?

Пярун.

Філёзофія ў прыказках.

— Ляпей з разумным згубіць, чым з дурнем знайсьці, — кажа сусед Пятрук, а сусед Янук адказвае:
— З разумным ніколі ня згубіш, а з дурнем ніколі не знайдзеш.

*

— Ня будзь чужым служкаю, калі можаш быць сваім панам,— кажа сусед Янук, а сусед Пятрук адказвае:
— Той, хто ёсьць сваім панам, ніколі ня будзе чужою служкаю.

Сьвіст.

Што ж я цяпер зраблю!?

— Што-ж ты гэтакі сумны?
— Быў-бы і ты сумны, каб і з табой сталася тое, што і са мной!
— Ну, а што?
— Бачыш ажаніўся я: узяў кабылу і жонку...
— Ну?!
— Ну: кабыла здохла, а жонка жыве. І што-ж я цяпер зраблю.


Хохлік.

У БРАЦЛАЎСКАГА ШКОЛЬНАГА ІНСПЭКТАРА.


Беларускі вучыцель: Пане інспэктар, як мае экзамэны, ці можаце мне даць беларускую школу?

Інспэктар: Саўсім дрэнна пішаце, ня можаце нават добра гаварыць папольску і рэкамэндацыяў ня маеце ніякіх. Калі хочаце, дык дам вам польскую школу ў Мёрах, а ў беларускую вы ня маеце кваліфікацыяў.

Хохлік.



Фабрыкі замёрлі. Напрасна галодны рабочы люд шукае тут працы.



Змораныя голадам работнікі шукаюць помачы ў дзяржаўных установах, але ўрадовец кажа: як заўсёды:

— Запамогі няма, ды й ня будзе!



Ідзі на вечны спачын, дарагі работнік! Ня трэба табе ўжо а ні працы, а ні ўрадовай запамогі, нават енкі галодных жонкі і дзяцей не разбудзяць цябе...

БЕЗРАБОТНЫ

(Праўдзівы абразок)

Будзе цяжкая зіма! — казалі з восені.

І праўда. Гэткага крызысу, гэтакага цяжару я не перажываў нават у крытычнейшыя часы вайны. На вёсцы працы ніякай. Усё замёрла, бы перад бурай якой.

— Што-то будзе, што-то будзе? — з нейкім жахам шэпчуць сяляне. Зарабіць ніскуль ні граша, а падаткі ўсе новыя і новыя падсыпаюць. Прыходзіцца адбіраць ад сям'і апошні кусок хлеба, — завясьці на кірмаш пуд-другі жыта, каб было чым заплаціць падатак.

Па праўдзе кажучы я ніякіх падаткаў не плачу, бо я безработны і ніякай маемасьці ня маю. А ўсё-ж такі жыцьцё зрабілася горай пекла, бо ў пекле, кажуць, чэрці нейкую там працу даюць: смалу вазіць, ці катлы падпаляць, а тут нічога ніякага, — хоць ты ваўком завый.

— Яначка, — кажа аднойчы да мяне жонка, схадзі ты да пана, можа ён табе дасьць якую працу. Людзі ходзяць працаваць у лесе, мо' і ты там пару злотых заробіш, бо голад, хлеба няма... На вачах яе былі сьлёзы.

Я ведаў, што пан да мяне ня ласкаў, а ўсё-ж такі пашоў.

— Што трэба? — неяк нібы закрычэў, нібы замычэў пан.

— Паночку! жонка галодная, дзеці. Зьлітуйцеся, дайце якую працу.

— Што?

— Працу! — з пакорай адказаў я.

Пан, прыжмурыўшы адно вока аглядзеў мяне з ног да галавы і яшчэ раз ад галавы да ног.

— Гэта, калі ня мыляюся той, што ў часе выбараў быў прэзасам нашага выбарчага камітэту? — са зьмяінай усьмешкай спытаўся пан.

— Але.

— Дык чаго-ж ты тут прыходзіш?

— Працы шукаю!

— А памятаеш, як ты казаў, што трэба зямлю ад паноў адабраць, сялянам надзяліць і гэтак далей. Што ня трэба выбіраць да сойму паноў, а толькі сваіх беларускіх паслоў. Дык вон з воч, бальшавік пракляты! Хай табе твае хамскія паслы дадуць працу!

Сьцяўшы зубы, я моўчкі выйшаў з палацу. Я быў вельмі сярдіт на сябе што пайшоў з паклонам да пана.

Весела чырыкалі на двары верабейчыкі:

— Крызыс! Крызыс! Крызыс!

Ногі неяк неахвотна паддаваліся мне, а пусты жывот напяваў даўно мне знаёмы галодны марш.

Я. Накрэвіч.

Паправіў.

Аднойчы з шпацыру да хаты
Па вёсцы нашай ад гумён
Ішлі адзін за адным два браты
(Двара Лужэцкага паняты)

Па йменьню: Янэк і Сымон.
І як на грэх, бяду якую,
Ў канцы аж самага сяла
Сустрэлі панічы сьвіньню такую.

(Нязвыкла для хлапцоў таўстую)
Што раптам абадвох цікавасьць узяла.
Ў здуменьні кажа Сымон брату:
— Глядзі, Янэчак, а я—я!..

Напэўна, аж таўсьцей за тату
(Хоць і тата наш чуць лезе ў хату)
Ўжо будзе гэтая сьвіньня!
— Цьфу! Ты, дурань, — лаець брата,

Пачаў Янэчак тут адразу:
— Ты з кім зраўняў гэту заразу! —
Такіх сьвіней, як ёсьць наш тата,
Ў жыцьці ня ўбачыш ты ні разу.

Я. Башкір.

У „доктара“.

Даведаўшыся з газэтаў, што прэзас „Тымчасовае Рады“ Паўлюкевіч называе сябе „доктарам“, селянін прыносіць да яго хворае дзіця.

— Што гэта? — пытае Паўлюкевіч.

— Паночку, — кажа селянін.—Дзіця захварэла: рады яму ня дам, усю ноч кідаецца ня сьпіць.

— Нясеце яго да доктара, бо і я сам усю ноч кідаюся ня сплю, усё думаю якую брахню напісаць цяпер у сваёй газэце.

М.

Абідзеўся.

— Ці ты чытаў „Беларускае Слова“.

— За каго ты мяне лічыш? Я чэсны чалавек.

Беларусы! Каб „Маланка“ бліскала ясьней узмацняйце яе падпіскаю!

Клопат дзеяча.

— Паганы час... Цяпер дык яшчэ не бяда... Нічога, што ўсюды безрабоцьце я тымчасам „дзяржаўны муж“ (mąż stanu) і можа добрых з паўтара года гэтак пацягнуцца, а што-ж далей?..

Гэткае пытаньне паўстала ў галаве нашага пасла Я—ча, і хоць новыя (нармальныя) выбары ў Сойм маюць быць неяк пад канец 1927 г., але да іх ён пастанавіў ужо рыхтавацца, і рыхтавацца не абы як там, а *консэквэнтна*, *„індівідуальна“* і наагул усяляк, як толькі любіць часамі казаць, квецячы свой аратарскі стыль можа й незаўсёды зразумелымі самому сабе лацінізмамі.

— Ня так, дык гэтак, — разважаў п. пасол далей, — пара варушыцца, час падрыхтоўваць масы, а дзеля таго, што масы беларускія -- гэта нашае сялянства, дык што-ж бы гэткае для іх выдумаць, каб пры патрэбе галаснулі дружна, як адзін???

Пачасаў патыліцу...

— „Сялянскі Саюз“! — перабіла яго задуму бліскучая, як маланка, гэніяльная думка.

— Во! гэта ідэя! — ўхапіўся за яе ўсею сваею істотаю п. пасол.

— Гэта нічога, што некалі я быў усерасейскім эсдэкам, бароўся за пролетарыят, гэта ўсё рэчы архіўныя. Хаця яно крыху і неконсэквэнтна — з Маркса пераехаць на нейкага беларускага Вітоса, — але годзі мне ўжо гэтае консэквэнцыі, кожны беларускі пісака мне ёю ў вочы тыкае...

— Глупства... мне трэба быць паслом, ня блага ўсё-ж такі... Годзі дарэмна езьдзіць у Жэнэву, або ў ССРР!

Я ня эс-эр, не!

Быў калісь ужо тыдзень на Лукішках. Годзі!..

Я так сабе — сялянскі лідэр.

Толькі вось неарганізована ніяк нашае беларускае сялянства. Трэба яго арганізаваць. Трэба скарыстаць яго галасы ў будучыні (і ўжо недалёкай) для новага мілага пасольскага мандату. Трэба!

З гэткімі думкамі п. Я--ч першы раз за ўсё сваё жыцьцё ўзяўся за непаслушнае яму пяро ды хоць надта марудна паўзла літара за літарай, але ў рэзультаце ўсё-ж такі выйшаў цэлы артыкул для чароднага нумару „Сялянскай Нівы“.

— Ну і клопат, ну і пот! — прабубнеў п. пасол, падпісаўшыся сваім тытулам, імем і прозьвішчам, — дастаецца-ж гэтым нашым бедным пісакам. Няхай яно... Найлепей — быць паслом.

Змарыўшыся, заснуў на пухавых пярынах і ўсю ноч прасьніў аб вечнасьці свайго пасольскага „Я“...

Звончык.

Зьняважыў.

Сярод хаты на услоне,
Накрыж рукі склаўшы,
Ляжыць Тэкля—Янкі жонка
Душу Богу аддаўшы.

А над ей казілам шчыра
Поп дыміць, махаець,
І пры боку Янка цяжка
Па жонцы ўздыхаець.

Ад парогу аж да столу
Сабрало ўсю вёску,
Душна, сумна, чаду поўна,,
Ад кадзіла й воску.

— Упакой рабу Таклюсю...
Сумна поп выводзе.
Плач глухі і уздыханкі
Чутны у народзе.

Плача й Янка, як малое,
І ніяк ня знаець,
За што поп яго Таклюсю
Рабой абзываець:

— Што з таго, калі другая
Тварам ня шурпата,
А ў яе няма парадку,
Стаіць лядам хата.

А нябожчыца хоць, праўда,
І была рабая,
Але зух была кабета,
Проста залатая.

Што яна папу зрабіла,
Да яе што маець,
Што на божай на пасьцелі
Рабой называець.

— Упакой рабу...—ізнова
Сумна поп выводзіць.
Янку злосьць бярэць, нябога
Аж з сябе выходзіць.

—Ты хоць Бога пабаяўся-б—
Папа ён спыняе:
— Іншых пацераў ня ўмееш,
Толькі як „рабая“!?

І за што яе, зязюльку,
Мёртвую, чапаеш?
Сам ты лепей углядзіся,
Што за жонку маеш:

Мая хоць раба ды толькі—
Хай Бог гэткіх плодзіць! —
А ў твае і твар—што драчка,
І да дзяка ходзіць!

Я. Башкір.

У Менску Беларускім на пошце.

— Прыймеце, калі ласка, забясьпечанае пісьмо.

— Что Вам угодно товарищ?

— Хачу здаць забясьпечанае.

— Какой-же Вы сдачи хотите?

— А бадай ты спракудзілася! Вось напасьць ліхая, палюдзку разгаварыцца нельга!

— Машечка (зварочваючыся да другое працаўнічкі) — идите пожалуйста сюда, а то я Гарецкого забыла дома, а он требует у меня с письма сдачи і говорит, што я спаскудилась.

Что это значит спаскудилась?

— (чуваць з публікі) Няхай толькі наш камсамол падрасьце ды ўзмацуецца, то Вы тут паскудзіць ня будзеце.

Госбанк у Маскве

(Дзяржаўны банк).

Камісар Банку чытае пісьмо, адтрыманае з аднаго з коопэратыўных банкаў Менскае акругі, пісанае пабеларуску і нічога ня могучы разабраць, заве сэкратара Яковлева.

— Тов. Яковлев, прочтите, пожалуйста, чего они хотят?

Яковлев (чытае ў паўголаса) — «У адказ на Ваш загад паведамляем, што справаздачу за мінулы час, г. зн. да 31 сьнежня ўключна вышлем Вам каля 15 студзеня г. г.

— «Отказ»?.. но в чем-же мы им отказали?

— „Загад“ — это видно описка, надо читать „за год“ „справаздача“ — ну этого никак не поймёш? „Час“, „снежанія“, „уключна“. . и причем тут „уключна“, ведь это не лодка... а тут совсем не понимаю. „Студень“— на кой чорт нам их студень, у нас не ресторан і не потребительное о-во.

Яковлев (зварочваючыся да Камісара і аддаючы яму пісьмо).

— Нет, товарищ, этого языка никак не поймеш, ну и понавыдумали мы этих республик... Современем беды только наберёмся...

— Камісар, — садитесь и пишите — (дыктуе) N... кооперативному Банку.

В ответ на письмо Ваше №... уведомляю, что за неимением в нашем банке лиц, владеющих языком, на коем написано Ваше письмо, по существу ответить Вам не могу.

Впредь при переписке с нами приказываю пользоваться исключительно русским языком.

Если-же у Вас нет лиц, владеющих русским языком, то можно писать на немецком, английском, еврейском, польском и китайском языке.

Гарэх.

„ДОБРЫ“ ПРЫКЛАД.

Прыхаджанін: Скажэце, бацюшка, як гэта маглі Вас з кансысторыі назначыць у наш прыход, не запытаўшыся ў нас, прыхаджанаў?

Бацюшка: „Глупые люди!“ — а калі вы нанімаеце пастуха да сваіх сьвіней, ці пытаецеся ў іх: здаволены яны сваім пастухом, ці не!?“

Н.

ПРЫЗНАНЬНЕ ПЕРАД СЬМЕРЦЯЙ.

Жыў сабе пан з паняй і мелі яны пяцёра дзяцей: чацьвёра разумных, а пяты — дурань.

Перад сьмерцяй пан пытаецца ў пані:

— Скажы мне, Люсечка, вось ты жывеш апошнюю мінуту на гэтым сьвеце, а я яшчэ ня ведаю, чыё гэта, дурное дзіця? Прызнайся, дарагая!

— Дурны сын, — то гэта наш, а чатыры разумныя, — то гэта чужыя (парабка Міколы), — адказала пані і памёрла.

Н.

Ксёндз і дзяўчына.

У канцы споведзі ксёндз пытаецца ў дзяўчыны: „Ці ня помніш яшчэ якіх грахоў?

На гэта дзяўчына адказвае:

— Я пасьлізнулася.

— Ну, дык гэта нічога, — кажа ксёндз: трэба хадзіць асьцярожна.

— Каб то-ж нічога?! — адказвае дзяўчына, — але што-ж я буду рабіць з тым... дзіцяткам (!).

Эс.

Народныя прыказкі.

— Пакуль „Маланка“ ня бліськне, — „Пярун“ ня грымне.

— Забіла „Маланка“ „Пяруна“, як апаліла „Авадня“.

Суседкі.

— На што гэта ты трымаеш варону ў клетцы? — пытаецца адна суседка.

— Бач, — кажа другая, — людзі гавораць, што варона можа жыць трыста гадоў, дык я хачу спраўдзіць гэта.

Эс.

„Вышэйшая культура“.

— Паночку, ці гэта праўда, што асаднікі маюць насадзіць у нас „вышэйшую культуру“?

— Праўда! Але адны асаднікі не патрапяць, — ім тыя паненкі дапамогуць, што папрыязджалі на „крэсы“. Ужо ў некаторых мясцох будуюць шпіталі для „хоруб заказьных“.

С—н—свой.

Панскія служкі.

— Дзеля чаго гэта ПэПэзСы выпускаюць на Палесьсі сваю газэту ў расейскай мове, якая завецца: „Красное Знамя“?

Бо цяпер, як пабраталіся з панамі і ўвадну дудку з імі граюць, дык баяцца нават піснуць што-небудзь у „хамскай“ беларускай мове, каб ня страціць ласкі ў паноў — эндэкаў.

Я. Я. Я.

Падпора дзяржаўнасьці.

— Чаму гэта кожны асаднік апрача асады на нашай зямлі, мае яшчэ і пасаду ў гміне, паліцыі, дэфэнзыве і г. п.?

— Бо бачыш, гэта — падпора дзяржаўнасьці на „крэсах“. Трэба-ж паказаць, што і на Беларусі ёсьць прыхільнікі „дзяржаўнае нацыі“.

С—н—свой.

Чаму „Тымчасовая“?

— Скажэце, чаму гэта „рада“ пана Паўлюкевіча завецца „Тымчасовай“, дый шчэ „Беларускай“?

— Пэўна-ж — таму, што складаецца з такіх-жа тымчасовых беларусаў, як і сам пан „доктар“ Паўлюкевіч.

Дармовая Абвестка.

У прыязных п. Паўлюкевічу органах прэсы надрукавана:

„Усебеларускі“ (палітычны) зьезд, які мае выбраць для ўсей Заходняй Беларусі „Сталую Беларускую Раду“ ўзамен „Тымчасовай“, адкладаецца на неазначаны час...

Дык — рыхтуйцеся-ж, усе беларусы, — да выбараў, не спазьнецеся...

Ад сябе просім ўсе гумарыстычныя часопісі перадрукаваць абвестку.

Баяцца крыўды.

— Ці ведаеш, чаму гэта паны баяцца зносінаў з бальшавікамі?

— Таму баяцца, каб бальшавікі не пакрыўдзілі панскія... (думаеш маёнткі? не...) белыя рукавічкі сваімі чорнымі мазалістымі рукамі.

Сыч.

Растлумачыў.

— Скажы, татка, — пытаецца малады хлапец у бацькі, — чытаў я ў газэтах, што нейкі „архіварыюс“ Студзінскі, ці ліха яго ведае як, хоча адабраць ад беларусаў Траецкія муры ў Вільні, што гэта за шышка, — гэты „архіварыюс“?

— Бачыш, сынку, „архі“ — гэта слова грэцкае, па нашаму азначае „галоўны“, напр., архі дыякан — галоўны дыякан. а... „варыюс“ — гэта відаць слова далікатнае—польскае, панашаму — проста вар'ят. Дык вось яно і выходзіць, што твой Студзінскі—архіварыюс ёсьць галоўны вар'ят ці, інакш кажучы, вар'ят з вар'ятаў.

Самазванны.

— Кім належыць падавацца праваслаўнаму чалавеку ў Польшчы, каб яго лічыць прыхільнікам «дзяржаўнае нацыі».

— Толькі Паўлюкевічам!

— І трэба быць доктарам?

— Не, не канешне, — можна быць тагды „доктарам“ і самазванным.

С—н—свой.

Згаварыліся.

Прыйшоў да старасты жыдок прасіць, каб яму далі пашпарт і кажаць старасьце:

— Быў я, паночку, аж пяць разоў у гміне Вішнеўскай, прасіў, каб далі мне пасьведчаньне на права атрыманьня пашпарту, але сказалі, што трэба да пана старасты, — дык я і прышоў, паночку, прасіць ласкі панскай даць мне пашпарт, бо вельмі паліцыя прыстае ў дарозе.

— А апінію (opinję) маеш? — спытаўся стараста.

— Піню, Піню маю ўжо тры гадкі. Хлопчык такі прыгожанькі, — ўвесь у маму ўдаўся.

М.

ПРЫСЯГА.

— Што здурнеў? П'еш гарэлку праз саломку?

— Мушу датрымаць слова. Я прысягнуў жонцы, што вусны мне не даторкнуцца больш чаркі.

Ад Рэдакцыі.

Дзякуем усім тым сьвядомым грамадзянам-беларусам, якія ўжо прыслалі падпіску на „**Маланку**“.

Дзякуем таксама ўсім тым, хто прыслаў нам добрыя пажаданьні і выразы здаволеньня нашай часопісяй.

Дзякуем яшчэ раз усім аўторам, якія прыслалі свае творы да рэдакцыі. Прысылайце яшчэ і яшчэ. Пакуль што даём гонарар толькі за лепшыя рысункі.

Просім не прысылаць: даплатных лістоў, не даваць розных паручэньняў і запытаньняў, бо адпісываньне карэспадэнцыі займае шмат часу.


Напамінаем, што пробных нумароў больш ня высылаем. Усе тыя, хто ня прыслаў грошаў, трэцяга нумару „Маланкі“ ўжо ня ўбачаць.

Пачынаючы ад 1-га сакавіка с. г. „Маланка“ будзе выходзіць акуратна 1-га і 15-га кожнага месяца.

Падпісная плата:

на год—8 зл.; на паўгода—4 зл.: на тры месяцы—2 зл. і на адзін месяц — 1 злоты.

Адрэс: Вільня, Завальная № 7 (Рэдакцыя „Маланка“).



І яны знаюць.

Кажуць людзі, што толькі сабакі брэшуць, а тут у гэтай газэтцы «доктар» Паўлюкевіч гэтак брэша, што нават ніякі сабака не патрапіць.

НАША ПОШТА.

Васіль Матылёк. За добрыя пажаданьні дзякуем Вам. Вельмі нас цешыць, што Вы шчыры сын Беларусі.

Эсэс. Вершы не падходзяць. Пішэце цікавейшыя.

Міртнок. Ваш фэльетон „Спосаб на ўсё ёсьць!“ — пайшоў да рэдакцыйнага кошыка. Пішэце што-небудзь цікавейшае.

Янка Сасін. Не падходзіць, — слаба пішаце.

Пётра Ермаковіч. Газэта „Беларуская Ніва“ выходзе тры разы ў тыдзень і каштуе два злотых на 1 месяц. Падпісвайцеся на „Маланку“.

В. Салавей. Ваш верш ня можна зьмясьціць у „Маланцы“ дзеля трох прычынаў: пішаце „чысьцюсенькай“ маскоўшчынай; за такія словы, як у Вас:

„Агромным пожарам раздуй!“ могуць раздуць наш нумар конфіскацыяй і апрача таго, хоць пішаце Вы прыгожа, а ўсё-ж не гумарыстычна. Высылаем Вам толькі № 2 „Маланкі“, а далей чакаем падпіскі.

Я. Оленцэвіч. Прысылайце падпіску, болей высылаць ня будзем.

М. Марушка і К. Грымута. Высылаем і чакаем падпіскі.

Беларуская Кавярня ў Баранавічах. „Маланку“ на крэдыт не высылаем.

Я. Дзешкоўскі. Маркі паштов. адтрымалі і перадалі паводле вашай просьбы. Жарт не падходзе.

Я. Пачопка. З вершаў карыстаем і вельмі дзякуем. Чакаем яшчэ.

У. Пышка. Высылаем вам толькі адзін нумар, а далей чакаем падпіскі.

Ст. Рымашэвіч. „Авадзень“ ня выходзе і ня ведама ці будзе выходзіць. Высылаем Вам адзін нумар „Маланкі“ на пробу.

Рэдактар-выдавец **Янка Касяк.** Друкарня Б. Клецкіна, Вільня